View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Мазурына Н.Г., г. Мінск, УА «БДПУ імя М.Танка”

## Варыянтнасць у беларускіх куставых песнях

Варыянтнасць, якую разумеюць як бытаванне твораў народнай культуры ў варыянтах, з'яўляецца формай існавання і эвалюцыі беларускага песеннага фальклору. Яна падпарадкуецца пэўным унутраным заканамернасцям, захаванне якіх забяспечвае жыццяздольнасць народнай традыцыі. Характар варыянтнасці ў немалой ступені залежыць ад функцыянальнай вобласці (абрадавыя і пазаабрадавыя цыклы), у якой непасрэдна здзяйсняецца рэалізацыя эвалюцыйных працэсаў.

Пры аналізе тыпаў варыянтнасці мы выкарыстоўвалі метад параўнання неаступных суадносін: 1) варыянт - варыянт; 2) варыянты - інварыянт; 3)інварыянт - варыянты. Калі ў другім выпадку на базе канкрэтных песенных варыянтаў мадэлюецца складарытмічны і лада-інтанацыйны інварыянт (пратып, варыянт-тып), то ў трэцім – мадэль песні (інварыянт) можа разглядацца ў якасці асновы для стварэння індывідуальных і зменлівых выканальніцкіх варыянтаў. Такі шлях – ад агульнага да індывідуальнага – можа паслужыць методыкай асваення лакальнай фальклорнай традыцыі эксперыментальнымі ансамблямі народнай песні, як гэта зрабіў Я.В.Яфрэмаў на матэрыяле спеўнай культуры Кіеўскага Палесся [1, с.16].

Варыянтнасць рэалізуецца як у вербальным, так і ў музычным кампанентах твораў адной фальклорнай песеннай парадыгмы, а таксама ў іх спалучэнні. Безумоўна, у кожнай мясцовасці існуюць лакальныя, дыялектныя перавагі тых ці іншых тыпавых напеваў, усё багацце і разнастайнасць якіх не можа быць зведзена да некалькіх дзесяткаў тыпаў. Эвалюцыя народных песень, развіццё варыянтаў адбываецца паралельна, шматузроўнева, рознанакіравана.

Характэрная прыкмета абрадавых песень – тыпавы (формульны) напеў. Выкарыстанне аднаго напеву-формулы з рознымі тэкстамі аднаго жанру і нават розных жанраў даследавана ў спецыяльным артыкуле І.І.Зямцоўскага [2]. Існуюць формульныя напевы не толькі і не столькі меладычныя, колькі рытмаструктурныя; паняцце "адзін напеў" падразумявае выкананне розных па тэксту песень на меладычную (дакладней – музычна-выканаўчую) формулу, устойлівасць якой магчыма ў даволі шырокіх межах ад амаль што літаральнай (у нотным запісы) тоеснасці да захавання толькі метрарытмічнай структуры; узнікненне напеваў-формул гістарычна папярэднічае ўзнікненню жанравай сістэмы песеннага фальклору наогул. Музычная формульнасць вядома практычна ўсім фальклорным жанрам і належыць да з'яў стадыяльнага характару, аднак жа формульнасць у фальклоры існавала не заўсёды – яна ўзнікла ў выніку працяглага гістарычнага развіцця музычнага інтанавання ў перыяд станаўлення мастацтва, які быў названы І.І.Зямцоўскім дажанравым.

Да сённяшняга часу ніколі не рабіліся спробы асэнсавання з’явы варыянтнасці на матэрыяле беларускіх куставых песень – унікальным жанры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

распаўсюджаным на Беларускім Палессі. Такое даследаванне стала магчымым толькі дзякуючы руплівай працы знакамітага беларускага фальклярыста і дырыжора У.І.Раговіча, які ўпершыню ў такой колькасці (113 напеваў і 210 слоўных тэкстаў) запісаў куставыя песні. Яны ўбачылі свет у першым томе “Песні святочнага календара” зборніка “Песенны фальклор Палесся” [3].

Рытмаструктурнае адзінства ўласціва ўсім 113 варыянтам напеваў куставых песень [3, с.118-276, №63-142]:




Такая рытмаформула набывае разнастайнае, багацейшае меладычнае, ладавае і рытмічнае напаўненне: вар'іраванне ў межах адной рытмаструктурнай пабудовы ўражвае сваімі магчымасцямі. Метрарытмічная сістэма насычана геміольнымі прапорцыямі – спалучэннем дзялення тактавай долі на 2 і на 3 у роўнай ступені: утвараюцца геміольныя рытмічныя малюнкі па гарызанталі і геміольная палірытмія па вертыкалі, калі кожны з некалькіх спевакоў выконвае свой варыянт распеву тыпавога напеву. Падобныя асаблівасці рытмікі надаюць песням гнуткасць, драматызаванасць, выдатна адлюстроўваюць пэўны душэўны надрыў, які па-мастацку спалучаецца з вобразнай сістэмай песень Кусты.

Амаль ва ўсіх вёсках Піншчыны адна і тая ж песня можа выконвацца-стварацца як у мажорным, так і ў мінорным нахіленні [3, с.127, 135, №66, 69]. Сярод песень Кусты, якія аб'яднаны адной рытмаструктурай, выдзяляюцца 3 тыпы формульных напеваў мажорнага і мінорнага нахілення дыятанічных ладоў:

1) з апорай на I, III і IV ступені [3, с.118-135, №63, 69];

2) з апорай на I, III і V ступені [3, с.168-175, №78, 81];

3) напевы мінорнага нахілення дыятанічных ладоў з апорай на I, III і VI ступені [3, с.216, 221, №109, 111].

Напевы куставых песень выкарыстоўваюцца народнай традыцыяй і ў якасці музычнай формулы для вяснянак [3, с.16-17, 36, № 4, 5, 13]. Рух меладычнай лініі разнастайны: хвалепадобны, узыходны і сыходны, насычаны арнаментальнай мелізматыкай. Спалучэнне рытмічнага, меладычнага і ладавага вар'іравання выклікае да жыцця цэлы спектр варыянтаў, што праілюструем на прыкладзе ўвасабленняў першага такту формульных напеваў першага тыпу:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




Дзве-чатыры ноты, якія прыпадаюць на адзін склад у запісе напева, паказваюць, што менавіта з іх ідзе падсвядомы выбар падчас выканання-стварэння кожнага варыянта песні ці яе страфы. Таму можна зрабіць вывад, што ў межах аднаго песеннага тыпу мелатыпавая варыянтнасць (на ўзроўні песень-варыянтаў) і меластрафічная варыянтнасць (варыянты напеву ад страфы да страфы ў межах адной песні) супадаюць. Гэты тэзіс распаўсюджваецца на ўсе беларускія народныя песні абрадавага цыклу.

Сюжэты тэкстаў куставых песень ахопліваюць як непасрэдна куставыя (і траецкія), змест якіх распавядае аб абрадавых дзеях, так і баладныя, сямейныя, любоўныя, сіроцкія. У спалучэнні з напевамі яны валодаюць вялікай сілай эмацыянальнага ўздзеяння.

Такім чынам, у цыкле беларускіх абрадавых песень і непасрэдна ў куставых песнях варыянтнасць мае свае асаблівасці. Мелатыпавая варыянтнасць валодае ў гэтай групе больш агульнай тыпізацыей і ў межах пэўнага тыпу супадае з меластрафічнай. Група тэкстаў абрадавых песень замацавана за тыпавым напевам (напевам-формулай), рытмаінтанацыйнае, ладавае і іншае напаўненне якога вар'іруецца ў даволі шырокіх межах, часам да захавання толькі метрарытмічнай структуры. Абагульненыя песенныя сюжэты маюць варыянты разгортвання, кожны з якіх валодае фондам варыянтаў кампазіцыйных прыёмаў, вербальнага зместу, лексікі і паэтыкі. Устойлівыя паэтычныя формулы, праз якія перададзены тыпізаваны змест, абавязкова маюць варыянты свайго выяўлення. Супастаўленне варыянтаў, варыянтаў і інварыянта дазваляе меркаваць аб некаторых напрамках полістадыяльнага эвалюцыйнага развіцця формы і зместу абрадавых песень.

Літаратура:

1. Ефремов Е.В. Вариантность и импровизационность в фольклорном исполнительстве: (На материале традиционной песенной лирики Киевского Полесья): Дис. ...канд. искусств.: 17.00.02 / Киев. гос. консерватория им. П.И.Чайковского. – Киев, 1989.- 173 с.
2. Земцовский И.И. Песня как исторический феномен // Народная песня: Проблемы изучения: Сб. науч. трудов. – Л.: ЛГИТМИК, 1983. – С. 4-21.
3. Раговіч У.І. Песенны фальклор Палесся: У 3 т. – Мн.: "Чатыры чвэрці", 2001. – Т. 1: Песні святочнага календара. – 2001. – 528 с.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ